РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 лютага 2025 г. ПЯТНІЦА № 31 (30419)

САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

# ПАДЛЯЧЫЦЦА І АДПАЧЫЦЬ

## У чым перспектывы медыцынскага турызму, і хто едзе з такімі мэтамі ў Беларусь

Штогод у Беларусь прыязджае вялікая колькасць жыхароў іншых краін не толькі для адпачынку і падарожжаў, але і для атрымання медыцынскай дапамогі. Летась Беларусь наведала больш за 160 тысяч грамадзян са 159 краін свету. Часцей за ўсё па лініі медыцынскага турызму да нас прыязджаюць грамадзяне Расіі, Кітая, Казахстана, Узбекістана, Туркменістана, Малдовы, Арменіі, Грузіі, Сірыі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Італіі. Больш як 60 % ад усіх замежных пацыентаў прыпадае на грамадзян СНД. Рост экспарту медыцынскіх паслуг па выніках 2024 года склаў 10 %. Замежнікаў прывабліваюць не толькі цэны, але і якасць медыцынскіх паслуг. Часта пацыенты прыязджаюць на лячэнне да канкрэтных беларускіх спецыялістаў з кваліфікацыяй сусветнага ўзроўню. Чым яшчэ адметная і прывабная Беларусь для лячэння і санаторна-курортнага аздараўлення і хто ён, медыцынскі турыст, які едзе ў нашу краіну, расказалі спецыялісты.

СТАР. 8–9







БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ: НАРМАТЫВЫ КОШТУ І ДАСТУПНАСЦЬ 5



ПА ПАЛІЧКАХ

# УСЁ — У СЯМ'Ю

## Каму і як дапамагае дзяржава?



Моладзь — галоўны рэсурс дэмаграфічнай бяспекі любой краіны. Ад таго, наколькі хлопцы і дзяўчаты гатовыя да стварэння сям'і, залежыць устойлівае развіццё краіны. Разам з тым маладая сям'я — вельмі ўразлівая катэгорыя, якая ў нашай дзяржаве можа разлічваць на ўсебаковую падтрымку. Якая сям'я ў нашай краіне лічыцца маладой, якія льготы, субсідыі і дапамогі ёй належаць, расказала начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.

СТАР. 8–9

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25031>

# НІЯКАЙ НАДЗВЫЧАЙШЧЫНЫ.

## Мы павінны быць гатовы працаваць у любых умовах, бо наша сельская гаспадарка —

Сёлетняя анамальна цёплая зіма, а цяпер яшчэ і добрыя замаразкі амаль без снегу — тэма не толькі дзяжурных размоў аб надвор'і. Ці будзем з ураджаем? — вось важнае і для краіны, і, бадай, для кожнага асобна ўзятага яе жыхара пытанне. І калі для асобнай прыватнай гаспадаркі яно не крытычнае, дык у маштабах дзяржавы — гэта адзін з найважнейшых складнікаў харчовай бяспекі і экспартнага патэнцыялу, якія, у сваю чаргу, адны з галоўных умоў захавання суверэнітэту і незалежнасці. Нездарма нават падчас урачыстай цырымоніі ўручэння дыпломаў доктара навук і атэстатаў прафесара, якая прайшла нядаўна ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнт цікавіўся ў вучоных, якія наступствы могуць быць на азімых пасевах у сувязі з неверагодна цёплай зімой. Тыя запэўнілі кіраўніка дзяржавы, што хвалявацца пакуль асаблівых нагод няма.

Зрэшты, было б дзіўна, каб спецыялісты адказалі інакш. Аб тым, што ў сельскай гаспадарцы трэба ўмець пераадольваць любыя капрызы клімату, Аляксандр Лукашэнка, знаёмы з работай на зямлі не па чутках, паўтарае кожны раз, калі хтосьці спрабуе рабіць спасылку на крытычнае земляробства. «Мы павінны быць гатовыя працаваць у любых умовах. Таму што наша сельская гаспадарка знаходзіцца ў зоне крытычнага земляробства. У нас неспрыяльная зона для вырошчвання ўсіх культур. Надвор'е кожны год падкідвае нам сюрпрызы: то замарозіць, то залье, то засушыць. Таму надзвычайшчыны няма, гэты год нічым не адрозніваецца ад папярэдніх». Гэтыя словы Прэзідэнта, сказаныя на адной з нарад па развіцці аграпрамысловага комплексу, можна аднесці і да сёлетняй сітуацыі.

Дык ці будзем мы сёлета ў маштабах краіны з ураджаем, калі ў лютым «галее рунь на полі»? Што рабіць, каб не залежаць ад капрызаў надвор'я? Карэспандэнты «Звязды» паглядзелі на тэму з розных ракурсаў і спыталі аб гэтым спецыялістаў, якія маюць да яе непасрэднае дачыненне.

### «РАЗАМ — АГРАРЫІ, НАВУКОЎЦЫ, ДЗЯРЖАВА — МЫ АБАВЯЗКОВА СПРАВІМСЯ»

**Член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар Беларускага цэментнага завода Ігар СЯРГЕЕЎ,** па першай спецыяльнасці аграхімік, не бачыць у сёлетніх умовах нейкай надзвычайнай сітуацыі. «Кожны год сельскія працаўнікі сутыкаюцца з суровымі ўмовамі надвор'я: ураганы, лівневыя дажджы або засуха, холад або спякота, — нагадвае сенатар. — Нездарма нашы тэрыторыі называюць зонай рызыкоўнага земляробства. Але, нягледзячы на складаныя кліматычныя ўмовы, а часам, можна сказаць, экстрэмальныя, аграрны сектар паспяхова выконвае пастаўленыя задачы па гарантаванні харчовай бяспекі ўсёй краіны». Вынік, на думку Ігара Сяргеева, залежыць ад правільнай каардынацыі, захавання ўсіх тэхналагічных працэсаў, выканальніцкай дысцыпліны і зладжанай працы кожнага звяна ў даволі складаным працэсе. «Можна быць дакладна ўпэўненым, што аграрыі зробяць усё, каб самы галоўны прадукт быў на сталах беларусаў, — перакананы ён. — Наш Прэзідэнт сам, як гаворыцца, чалавек ад зямлі. Таму ўсе нюансы работы сельскай гаспадаркі не па чутках ведае да драбнюткіх падрабязнасцяў. І нездарма ўдзяляе такую пільную ўвагу і аказвае ўсялякую падтрымку аграрнаму сектару. Сумнявацца не даводзіцца: будзем з ураджаем».

**Член Савета Рэспублікі, генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната Алег ІВАНОЎ** таксама адзначае важную ролю кіраўніка дзяржавы ў гэтым пытанні: «Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зусім правільна гаворыць аб тым, што ў нас няма панацыі крытычнае земляробства — у нас яно заўсёды крытычнае. Прырода непрадказальная: то засуха, то лівні, то замаразкі выпрабоўваюць нас на трываласць. Але менавіта ў такіх умовах куецца характар, праяўляецца наша здольнасць пераадольваць цяжкасці разам. Таму беларускі лідар удзяляе аграпрамысловай сферы асаблівую ўвагу. Дзяржавай створаны ўсе ўмовы для падтрымкі нашых аграрыяў, эфектыўнай работы на месцах. Выдзяляюцца льготныя крэдыты, субсідыі на набыццё тэхнікі, падтрымліваюцца навуковыя распрацоўкі ў галіне сельскай гаспадаркі».

«І гэта не выпадковасць, а мэтанакіраваная палітыка, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам нашага Прэзідэнта, чалавека, які дакладна разумее ўсе тонкасці АПК, — адзначае Алег Іваноў. — Ведае, як вырасціць багаты ўраджай, накарміць краіну і зрабіць унёсак ва ўмацаванне эканомікі. Яго асабістая ўвага да патрэб вяскоўцаў, глыбокае разуменне спецыфікі галіны — залог нашай упэўненасці ў заўтрашнім дні».

Пры гэтым, заўважае сенатар, дзяржава стварае ўмовы, але вынік залежыць ад працы на месцах. Таму дзяржаўная падтрымка — гэта толькі палова справы. Многае залежыць ад захавання тэхналогій, прафесіяналізму і самааддачы саміх аграрыяў. Важна не толькі атрымаць рэсурсы, але і правільна іх выкарыстоўваць. Выканальніцкая дысцыпліна, увага да дэталяў, навуковы падыход да земляробства — кожны павінен адказна ставіцца да сваёй справы, разумець, што ад яго працы залежыць харчовая бяспека ўсёй краіны.

«Разам — аграрыі, навукоўцы, дзяржава — мы абавязкова справімся, — гаворыць Алег Іваноў. — Будзем з ураджаем нягледзячы ні на што, накормім краіну і забяспечым харчовы суверэнітэт Беларусі!»

### КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ МНОГАЕ

**Член Савета Рэспублікі, дырэктар ААТ «Ціхінічы» Рагачоўскага раёна Юрый ВАСІЛЬЦОЎ** лічыць, што ў атрыманні добрага ўраджаю важную ролю адыгрывае і чалавечы фактар. «Беларускія аграрыі дакладна разумеюць, што задача забеспячэння ўраджаю — адна з галоўных для краіны, — адзначае ён. — Людзі працы сумленна і адказна працуюць на зямлі, адчуваюць падтрымку дзяржавы, бачаць асабістае і дзяржаўнае стаўленне да аграрнай галіны нашага Прэзідэнта, яго дальнабачную палітыку ў вырашэнні задачы накарміць свой народ і атрымаць добрыя грошы ад продажу прадуктаў харчавання. Адказны і дасведчаны падыход нашага кіраўніка дзяржавы ў кіраванні аграрным сектарам не выпадковы — Прэзідэнт асабіста прайшоў школу земляробства, і гэты досвед каштоўны».

Юрый Васільцоў паведаміў, што ў ААТ «Ціхінічы» па стане на пачатак лютага ўжо ўся тэхніка мела 100-працэнтную гатоўнасць і прайшла дзяржтэхагляд. «Так што нашы аграрыі гатовы забяспечыць дастойны ўраджай», — запэўніў ён.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Іван МАРКЕВІЧ** таксама заўважае, што на працягу ўсяго прэзідэнцкага тэрміну кіраўнік дзяржавы як ніхто ўдзяляе максімальную ўвагу сельскай гаспадарцы і ўсяму аграпрамысловаму комплексу краіны. У той жа час дэпутат звярнуў увагу на адсутнасць моцных гаспадароў у некаторых гаспадарках.

Па словах парламентарыя, таксама сёння трэба працаваць над тым, каб зніжаць сабекошт прадукцыі, паляпшаць яе якасць. На яго думку, варта нарошчваць і аб'ёмы гандлёвай прадукцыі, якая неабходна перапрацоўшчыкам і павінна з'яўляцца на паліцах нашых сеткавых крам.

«Мы зрабілі сур'ёзныя зрухі, у першую чаргу, забяспечыўшы харчовую бяспеку і нарасціўшы экспарт, у што калісьці мала хто верыў, — канстатаваў старшыня Пастаяннай камісіі. — Упэўнены, будзе экспарту і на 10 мільярдаў. Па многіх пазіцыях мы ўваходзім у пяцёрку краін свету па экспарце перапрацаванай прадукцыі. Гэта таксама вельмі здорава».

### ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ РЫХТАВАЦЦА ПАЧАЛІ ЯШЧЭ Ў СНЕЖНІ

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Мікалай ЛЕШЫК** адзначыў, што работнікі галіны ў гэты час рыхтуюць тэхніку, назапашваюць угнаенні. Ён адзначыў, што ў цэлым па краіне сітуацыя з падрыхтоўкай да будучай сяўбы цалкам прымальная. Насення збожжавых культур у гаспадарках дастаткова.

Па кукурузе нашы заводы (якіх у нас два) забяспечваюць пасяўныя плошчы насеннем у памеры 27 тысяч тон пры патрэбе 34 тысячы тон. Больш за 5 тысяч тон імпартнай кукурузы ўжо набыта, цяпер застаецца закупіць за мяжой 2 тысячы тон гэтага насення.

Амаль поўны аб'ём насення цукровых буракоў закуплялі ў больш паўднёвых краінах, таму што ў нашых шыротах іх амаль немагчыма вырасціць. Але ў гэтым годзе каля 6 тысяч 300 пасяўных адзінак цукровых буракоў плануецца выкарыстоўваць нашых сумесных беларуска-расійскіх і беларуска-польскіх гібрыдаў. Гэта складзе каля 5 % ад усёй структуры па бураках.

Насеннай бульбы ў нас больш чым дастаткова. Але, каб палепшыць якасць другога хлеба нашай краіны, пэўны працэнт такой бульбы закупляецца за мяжой. Гэта робіцца ў тым ліку для вывядзення асобных сартоў, прызначаных для паглыбленай перапрацоўкі, адзначыў Мікалай Лешык.

Паводле інфармацыі Мінсельгасхарча, пад яравую сяўбу 2025 года неабходна назапасіць крыху больш за 1,17 мільёна тон усіх мінеральных угнаенняў. На 12 лютага ўсяго ў краіне назапашана 600,2 тысячы тон — 51,4 % да плана. У Брэсцкай вобласці назапашана 50,1 % да плана, у Віцебскай — 37,2 %, Гомельскай — 41,6 %, Гродзенскай — 68,6 %, Мінскай — 56,9 %, Магілёўскай — 48,6 %. Ва ўсіх рэгіёнах тэмпы работ апярэджваюць леташнія. Час для таго, каб назапасіць мінеральныя ўгнаенні ў поўным аб'ёме, яшчэ ёсць, але цягнуць да апошняга не варта, лічаць у Мінсельгасхарчы.



# УРАДЖАЙ БУДЗЕ

## у зоне крытычнага земляробства, падкрэслівае Прэзідэнт

### СКЛАДНІКІ ПОСПЕХУ — СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Гэты год не такі ўжо і анамальны па клімаце. На пачатак трэцяга тысячагоддзя прыйшоўся найбольш працяглы перыяд пацяплення за апошнія 130 гадоў. Вынікам сталі засухі, ліўні, позні я вясновыя замаразкі... Мы спыталі ў навукоўцаў, што можа навука супрацьпаставіць умовам надвор'я.

У кліматычных умовах, характэрных для сучаснай Беларусі, асабліва важныя аптымальныя тэрміны сяўбы, каментуе **загадчык лабараторыі рэгуляцыі росту і развіцця раслін РУП «Навукова-практычны цэнтр па земляробстве Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Уладзімір ХАЛАДЗІНСКІ:**

— Спазніцца з тэрмінамі сяўбы вельмі лёгка, і спазненне — адзін з фактараў, што лімітуе ўраджайнасць.

Яшчэ адзін складнік ураджайнасці — дакладнае земляробства, тлумачыць суразмоўца.

— У Беларусі праводзіцца лічбавізацыя землекарыстання, ствараецца банк электронных карт палёў. Гэта дазволіць у далейшым прымаць найбольш рацыянальныя рашэнні для кожнага канкрэтнага выпадку, у перспектыве — у тым ліку з удзелам штучнага інтэлекту. Наступны этап (і ён таксама ўжо актыўна рэалізоўваецца) — сістэма навігацыйнага кантролю тэхнікі, якая дазваляе дамагчыся стабільна высокай якасці ўсіх тэхналагічных аперацый. Акрамя таго, у нашай краіне ўжо прымяняюцца сістэмы дыферэнцыяванага ўнясення ўгнаенняў і пестыцыдаў.

Разам з інтэнсіфікацыяй тэхналогій селекцыя збожжавых і іншых культур у нашы дні — вызначальны фактар ураджайнасці. Работа па стварэнні канкурэнтных сартоў сельскагаспадарчых культур беларускімі селекцыянерамі праводзіцца на пастаяннай аснове.

— У НПЦ НАН Беларусі па земляробстве вынікова вядзецца селекцыя, арыгінальнае і элітнае насенняводства каля 40 відаў сельскагаспадарчых раслін, — адзначае **доктар сельскагаспадарчых навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, намеснік дырэктара НПЦ НАН Беларусі па земляробстве Эрома УРБАН.** — У цэлым, за апошнія 60 гадоў селекцыянерамі цэнтра створана каля 600 сартоў збожжавых, зернебабовых, кармавых, тэхнічных і крупяных культур. Усе зарэгістраваныя сарты маюць высокі ўзровень ураджайнасці: у збожжавых больш за 100 ц/га, рапсу і зернебабовых культур — да 50—60 ц/га, у лёну-даўгунцу ўраджайнасць ільнотрасты на ўзроўні 46—51,0 ц/га, гібрыдаў цукровых буракоў — 60—75,0 т/га. Раяніраваныя айчынныя сарты паспяхова канкуруюць з найлепшымі дасягненнямі замежнай селекцыі, падкрэслівае доктар навук, і гэта ўжо ацанілі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі: усё большае распаўсюджванне сарты беларускай селекцыі атрымліваюць у краінах СНД. Так, калі казаць пра дасягненні селекцыянераў НПЦ НАН Беларусі па земляробстве, 55 сартоў уключаны ў дзяржаўныя рэестры для выкарыстання ў Расіі — у 37 рэгіёнах, дзе займаюць у агульнай складанасці больш за 2 млн га.

Сарты і гібрыды айчыннай селекцыі больш адаптаваны менавіта да беларускіх кліматычных умоў. Але акрамя гэтага працаваць з айчыннай селекцыяй трэба і па шэрагу іншых прычын.

— Перш за ўсё, селекцыйная работа будуецца на пажаданнях сельгасвытворцаў, якія мы пастаянна адсочваем, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце НПЦ НАН Беларусі па бульбаводстве і агародніцтве, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт Андрэй ЧАЙКОЎСКІ.** — Акрамя таго, няма рызыкі адсутнасці на рынку таго ці іншага пасяўнога матэрыялу ў сувязі з міжнародным становішчам. І самае галоўнае — погляд у перспектыву: калі селекцыйная навука ў краіне запатрабаваная, яна развіваецца.

Ураджайнасць збожжавых, кармавых, іншых сельскагаспадарчых культур — пакачнык комплексны. Дакладнае выкананне тэхналагічных аперацый, пачынаючы з падбору сорту, — залог атрымання максімальнай прадукцыйнасці, рэзюмуюць навукоўцы.

### З УЛІКАМ ПАТЭНЦЫЯЛУ ЗЕМЛЯЎ

Гомельшчына ў нашай зоне крытычнага земляробства, можна сказаць, — у эпіцэнтры гэтай зоны: тут пясчаная глеба, частыя засухі. Таму асаблівая ўвага — структуры пасяўных культур. Як адзначыла **начальнік упраўлення інтэнсіфікацыі раслінаводства камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама Алена ФІЛІПОВІЧ,** у структуры сёлетняй вясенняй пасяўной застануцца класічныя для Гомельскага рэгіёна сельгаскультуры. У цэлым плануецца пасеяць каля 3,7 тысячы гектараў яравой пшаніцы, 15,6 тысячы га — ячменю, 4,6 тысячы га — грэчкі і 1,4 тысячы га — проса, а таксама 35 тысяч гектараў аўса і больш за 30 тысяч гектараў зернебабовых культур. Дарэчы, зернебабовы клін у структуры яравой сяўбы на палях паўднёва-ўсходняга рэгіёна прыкметна вырас. Калі ў апошнія гады зернебабовых засявалася да 9 тысяч гектараў, то гэтай вясной пад іх адвядуць 33 тысячы гектараў. Акрамя таго, для аграрыяў стаіць задача падрыхтавацца і да сяўбы траў. Сёлета плануецца пасеяць на раллі больш як 30 тысяч гектараў шматгадовых траў. З гэтых плошчаў каля 17 тысяч гектараў зойме люцэрна. Пад сяўбу стратэгічнай для Гомельскай вобласці кукурузы — у цэлым на зялёную масу і зерне — будзе адведзена больш як 280 тысяч гектараў.

А вось у структуры азімых культур, закладзеных у вобласці, вялікую долю займае ячмень. Да гэтай культуры як да найбольш уразлівай да значнага «мінуса» ў лютым — павышаная ўвага. З занепакоенасцю канстатуюць аграрыі: маразы на Гомельшчыну прыйшлі цяпер «на голую зямлю», без снежнага покрыва. У падтрымку земляробаў у клопаце аб гэтай культуры — айчынная навука.

— Гаспадаркі вобласці вельмі шчыльна працуюць са спецыялістамі навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве. Супрацоўніцтва вядзецца як у тэарэтычнай частцы — арганізацыі навучальных курсаў і семінараў, так і ў фармаце практычных кансультацый па асаблівасцях вырошчвання ўсіх культур, доглядных мерапрыемстваў, — зазначыла Алена Філіповіч.

Яна звярнула ўвагу, што на тэрыторыі Гомельскай вобласці па даручэнні Прэзідэнта вучонымі закладзены вопыт па тэрмінах сяўбы азімага рапсу і іх уплыву на ўраджайнасць. Таму што, як правіла, на Гомельшчыне тэрміны сяўбы гэтай культуры прыпадаюць на засушлівыя перыяды.

### «У ЛЮБОЕ НАДВОР'Е МЫ ЗАЎСЁДЫ ІМКНЁМСЯ ЯКАСНА ПРАЦАВАЦЬ»

**Аляксандр ШАМАНАЎ, галоўны аграном СВК «Агракамбінат Сноў»,** аднаго з флагманаў сельгасвытворчасці не толькі Міншчыны, але і ўсёй краіны, на ўласным вопыце ведае, наколькі захаванне агратэхналогій важнае для атрымання высокіх ураджаяў.

«У любое надвор'е мы заўсёды імкнёмся якасна працаваць. Аднак для атрымання добрых ураджаяў неабходна працаваць па сезоне, усё павінна быць тэхналагічна апраўдана. У гэтым і ёсць сакрэт поспеху. Усё павінна рабіцца толькі з розумам, з тэхналагічнай дыктатурай, захаваннем усіх тэхналагічных мерапрыемстваў і, вядома ж, з любоўю да сваёй работы. Асабліва гэта датычыцца тых людзей, якія дні і ночы напралёт працуюць на зямлі».

Па меркаванні галоўнага агранома сельгаспрадпрыемства, дрэннай зямлі не бывае, як не бывае і дрэннага надвор'я, і дрэнных культур. Поспех залежыць выключна ад ведаў і адносін людзей, якія валодаюць імі, да сваёй справы. Пастаянна вывучаючы і аналізуючы перадавы вопыт у аграрнай галіне, у тым ліку замежны, ён упэўнены, што культура земляробства ў нас на самым высокім узроўні.

«Дзякуючы мудрай палітыцы Прэзідэнта, накіраванай на падтрымку вёскі, за кошт укаранення тэхнічных інавацый, новых сартоў мы на тых жа землях атрымліваем зусім іншыя ўраджаі. Сёння ў спецыялістаў дастаткова магчымасцяў, каб разлічваць на высокія вынікі, хоць пагодны фактар з рахункаў не скінеш. Кожная пасяўная і ўборачная — новы экзамен. І ў той жа час доследы з тэхналогіямі, сартамі, улічваючы глебава-кліматычныя асаблівасці, даюць магчымасць выбіраць аптымальныя варыянты, распрацоўваць найбольш эфектыўную палявую стратэгію. У нас на прадпрыемстве яна максімальна заточаная пад патрэбы жывёлагадоўлі. Выходзячы з гэтага, карэкціруем пры неабходнасці структуру пасеваў на карысць таго ці іншага кампанента для кармавога статка. І тут немагчыма пераацаніць унёсак спецыялістаў усіх службаў і работнікаў на кожным участку тэхналагічнага ланцужка: і паляводаў, і жывёлаводаў», — падагульніў Аляксандр Шаманаў.

**Фота БелТА.**

Дарэчы

### Казаць пра пашкоджанне азімых рана

У аддзеле аграметэаралогіі службы гідралогіі і аграметэаралогіі Белгідрамета сітуацыю з азімымі каментуюць так:

«За мінулы перыяд каляндарнай зімы небяспечных гідраметэаралагічных з'яў, якія маглі б выклікаць пашкоджанні сельскагаспадарчых культур, на тэрыторыі Беларусі не назіралася. Аднак у апошнія дні сітуацыя стала мяняцца. У сувязі з узмацненнем маразоў аграметэаралагічнае становішча на тэрыторыі краіны ўскладнілася. Халоднае надвор'е спрыяе прамярзанню глебы. У большасці раёнаў краіны глеба прамерзла да 10—20 сантыметраў, месцамі — больш за 25 сантыметраў. Тэмпература глебы паніжаецца. Па стане на раніцу 13 лютага вышыня снежнага покрыва на палях на большай частцы краіны не большая за 1—5 сантыметраў, у паўднёва-заходняй частцы Беларусі снежнае покрыва адсутнічае».

Аграсіноптыкі не выключаюць, што пры такой сітуацыі найменш марозаўстойлівыя культуры, такія як азімы рапс і азімы ячмень, нізкія лютаўскія тэмпературы могуць месцамі пашкодзіць. Большасць жа зімавальных культур павінны вытрымаць гэтыя маразы без істотных пашкоджанняў. Для больш дэталёвай ацэнкі стану пасеваў у канцы лютага асобнымі падраздзяленнямі Белгідрамета будзе праведзена вывучэнне пасеваў азімых культур для вызначэння іх жыццяздольнасці».



ВЕКАПОМНАЕ

### Ігар Сергяенка:

# «НАШ СВЯТЫ АБАВЯЗАК — НЕ ДАПУСЦІЦЬ СКАЖЭННЯ ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ, ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ»



## Парламенцкія чытанні ў Нацыянальным мастацкім музеі распачалі цыкл мерапрыемстваў з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі

Іх тэма — «Ад Брэсцкай крэпасці да Берліна: вытокі мужнасці і гераізму савецкага чалавека». Асветніцкі праект, ініцыяваны дэпутатамі, накіраваны на больш глыбокае асэнсаванне грамадствам каштоўнасцяў, закладзеных у аснову беларускай мадэлі дзяржаўнасці. На працягу года парламенцкія чытанні плануецца правесці на мемарыяльных комплексах і гісторыка-культурных аб'ектах краіны.

Як звярнуў увагу **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, мэта парламенцкіх чытанняў — яшчэ раз вярнуцца да памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, скарэкціраваць падыходы да асвятлення многіх фактаў сучаснай гісторыі з улікам важнасці гэтай тэмы асабліва пры выбудоўванні камунікацыі з выбаршчыкамі падчас правядзення грамадска-палітычных мерапрыемстваў.

«9 Мая — гэта святая дата для кожнага жыхара нашай краіны, — падкрэсліў спікер. — І чым далей у мінулыя грозныя гады адыходзіць Вялікая Айчынная вайна, тым найвялікшым з'яўляецца подзвіг савецкага народа. І тым больш знаходзіцца палітыкаў, рознага кшталту ідэолагаў, якія імкнуцца і апаганіць, і сказіць гістарычную праўду ў выгадным для сябе рэчышчы».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў канстатаваў, што Вялікая Айчынная вайна многімі падаецца як частка, фрагмент Другой сусветнай вайны. Адпаведна, па яго словах, указваецца, што вайну развязаў Савецкі Саюз, а выйгралі Злучаныя Штаты Амерыкі, Вялікабрытанія і Францыя. У многіх заходніх краінах фактычна легалізавана нацысцкае прывітанне.

«Таму наш святы абавязак — не дапусціць скажэння гістарычнай памяці, гістарычнай праўды, — падкрэсліў Ігар Сергяенка. — Менавіта савецкі салдат і савецкі народ вынес асноўны цяжар вайны. Савецкі салдат, падняўшыся ва ўвесь рост, абараніў свет ад карычневай чумы. Менавіта савецкі салдат прайшоў дарогамі вайны з баямі, адступаючы, затым наступаючы, фактычна чатыры гады. Савецкі салдат узняў Сцяг Перамогі над рэйхстагам. І савецкі, а не англійскі, не амерыканскі салдат распісаўся на сцяне звергнутага рэйхстага. Вельмі важна казаць аб гэтым моладзі».



Удзельнікі чытанняў азнаёміліся з культурна-патрыятычным выставачным праектам Нацыянальнага мастацкага музея «Сцяг Перамогі», які прысвечаны святкаванню Вялікай Перамогі і заканчэнню Вялікай Айчыннай вайны.

«Сімвалічна, што гэта выстаўка праходзіць менавіта пад такой назвай, — лічыць Ігар Сергяенка. — Сцяг — гэта не проста сімвал. Сцяг — гэта ўвасабленне гераізму, доблесці нашых воінаў. З гэтымі сцягамі мільёны савецкіх салдат, падпольшчыкаў, партызан ішлі ў бой, а працаўнікі тылу кавалі ўсё для перамогі над ворагам».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў удакладніў, што Сцяг Перамогі ўвабраў у сябе самыя розныя сцягі. «Гэта і сцяг часці, які быў выратаваны ўдзельнікам абароны Брэсцкай крэпасці сяржантам Семенюком (яго ён знайшоў у 1956 годзе на руінах Брэсцкай крэпасці), — канкрэтызаваў спікер. — Гэты Сцяг Перамогі ўвабраў у сябе і сцягі баявых часцей, якія выходзілі з акружэння ў 1941 годзе і захавалі свае сімвалы. Гэтыя сцягі ўзнімаліся пры вызваленні нашых гарадоў і сёл, пры заняцці важных і невялікіх вышынь, якія адбівалі ў праціўніка». Найвышэйшым увасабленнем мужнасці савецкага народа, па яго словах, з'яўляецца Сцяг Перамогі, які быў узняты над рэйхстагам у ноч на 1 мая 1945 года.

З тэматычнымі дакладамі на парламенцкіх чытаннях выступілі дэпутаты-гісторыкі Вячаслаў Даніловіч і Ігар Марзалюк, а таксама навуковы супрацоўнік цэнтра ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Павел Ждановіч. Па завяршэнні выступленняў адбыўся абмен думкамі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

БЯСПЕКА



# ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ГРАНІЦЫ?

## Актуальныя задачы абмеркавалі ў ДПК

Падвядзенне вынікаў аператыўна-службовай і іншай дзейнасці органаў пагранічнай службы за мінулы год і ўдакладненне прыярытэтных сёлетніх задач сталі цэнтральнай тэмай пашыранага пасяджэння калегіі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта.

Як адзначыў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ**, які ўзяў удзел у рабоце калегіі, ваенна-палітычная абстаноўка вакол Беларусі застаецца складанай, працягваецца павелічэнне ваеннай прысутнасці краін НАТА каля нашых граніц. «У гэтых умовах адной з асноўных задач з'яўляецца адсочванне ваенна-палітычных працэсаў у прыгранічных раёнах сумежных краін, прагназаванне магчымых выклікаў і пагроз для нашай дзяржавы і адэкватнае рэагаванне на тэндэнцыі развіцця абстаноўкі ў пагранічнай прасторы. Задачы мінулага года органамі пагранічнай службы ў цэлым выкананы, шмат зроблена ў пытаннях павышэння эфектыўнасці аховы граніцы, стварэння матэрыяльнай базы, інжынернага абсталявання. Сёлета неабходна асноўную ўвагу аддаць нарошчванню інжынернай інфраструктуры і вайсковага кампанента, перш за ўсё на украінскім напрамку, узмацненню існых і стварэнню новых пагранічных падраздзяленняў, актыўнаму аснашчэнню манеўраных груп сучаснай тэхнікай, а падраздзяленняў граніцы — беспілотнымі лятальнымі апаратамі рознага прызначэння і сродкамі барацьбы з імі», — заявіў дзяржсакратар Савета бяспекі.

На фоне мілітарызацыі прыгранічча Літвы, Латвіі і Польшчы, бясконцага нарошчвання пагранічных загарод украінскім бокам, а таксама штучна створаных перашкод у міжнародных зносінах у пунктах пропуску беларуская пагранслужба працягвала забяспечваць перасячэнне граніцы іншаземцамі ў бязвізавым парадку, правядзенне мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці аховы граніцы, аснашчэнне падраздзяленняў узбраеннем і тэхнікай, удасканаленне баявой падрыхтоўкі.

**Старшыня Дзяржпагранкамітэта Канстанцін МОЛАСТАЎ** падкрэсліў, што аднымі з галоўных задач ведамству пры зацвярджэнні рашэння на ахову дзяржаўнай граніцы кіраўнік дзяржавы вызначыў: своечасова выявіць пагрозы, якія зыходзяць звонку Рэспубліцы Беларусь, пастаянна ўдасканальваць, забяспечыць гатоўнасць сіл і сродкаў выканаць задачы ў любых умовах абстаноўкі. У гэтых мэтах пры ахове дзяржаўнай граніцы органамі пагранслужбы падтрымліваецца цеснае ўзаемадзеянне з усімі сілавымі ведамствамі краіны.

Надзейнай абароне рубяжоў будзе садзейнічаць іх далейшае абсталяванне інтэлектуальнымі сістэмамі аховы і аўтаматызаванымі пастамі тэхнічнага назірання, разумнымі датчыкамі ў рамках дзяржаўнай праграмы «Пагранічная бяспека на 2021—2025 гады». Эфектыўнасць абароны заклікана павысіць актыўнае прымяненне пілатаванай і беспілотнай авіяцыі. Сёлета ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы працягнецца актыўнае будаўніцтва новых комплексаў пагранічных застаў на беларуска-ўкраінскай граніцы. Падраздзяленні пагранічнага кантролю дааснасцяць сучаснымі тэхнічнымі сродкамі, атрымае далейшае развіццё пагранічная інфраструктура ў пунктах пропуску.

Прыярытэтнымі задачамі для пагранічнага ведамства ў 2025 годзе будуць лічыцца таксама забеспячэнне гатоўнасці да спынення ўзброеных і іншых правакацый на дзяржаўнай граніцы, прадаўжэнне нарошчвання сістэмы сіл і сродкаў органаў пагранічнай службы, іх аснашчэнне сучасным узбраеннем і тэхнікай, удасканаленне баявой падрыхтоўкі.

### У тэму

У рамках пасяджэння калегіі адзначаны пераможцы конкурсу «Найлепшае падраздзяленне (спецыяліст) органаў пагранічнай службы» па выніках 2024 года. Сярод воінскіх часцей найлепшай прызнана Гродзенская пагранічная група, якую ўзначальвае палкоўнік Аляксандр Давідзюк. У намінацыі «Найлепшая пагранічная камендатура» дыплом заваявала пагранкамендатура «Маларыта» Брэсцкай пагрангрупы, якой камандуе маёр Яўген Заяц. Званне найлепшай — у пагранічнай заставы «Хінічаў» Пінскага пагранатрада, яе начальнік — капітан Сяргей Янчы. Чарговы заслужаны дыплом найлепшай манеўранай групы зноў у гродзенскіх пагранічнікаў, яе ўзначальвае падпалкоўнік Юрый Дудка. Найлепшым у сваёй намінацыі стала аддзяленне пагранічнага кантролю «Варшаўскі мост» Брэсцкай пагрангрупы, якім кіруе маёр Дзмітрый Брыштэль.

# БУДАВАЦЬ БОЛЬШ І ЛЕПШ

## Урад мае намер стрымліваць рост цэн на будаўніцтва жылля

**Аблвыканкамы і Мінгарвыканкам сумесна з Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва сёлета павінны забяспечыць выкананне заданняў па ўводзе ў эксплуатацыю не менш як 4,5 млн кв. м агульнай плошчы жылых дамоў, у тым ліку і тых, што будуюцца з дзяржаўнай падтрымкай, стварыць задзел на 2026 год.**



Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў «Аб мерах па выкананні заданняў па будаўніцтве жылых дамоў і аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры да іх на 2025 год». Яна прынята на днях. Дакументам устаноўлены планы па будаўніцтве жылля на 2025 год.

**Адзін з асноўных пунктаў — неабходнасць прыняцця мер па стрымліванні росту кошту будаўніцтва, рэканструкцыі жылля з дзяржпадтрымкай і за кошт бюджэтных сродкаў, забяспечыўшы выкарыстанне праектаў эканамічных жылых дамоў тыпавых спажывецкіх якасцяў. У дакуменце таксама адзначана, што трэба ўсебакова садзейнічаць грамадзянам у будаўніцтве індывідуальнага жылля.**

Аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму і міністэрствам фінансаў і энергетыкі прадпісана забяспечыць своечасовае штомесячнае фінансаванне будаўніцтва за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы.

Таксама дакумент устанаўлівае гранічны нарматыў кошту 1 кв. м агульнай плошчы для выдачы Беларусбанкам ільготнага крэдыту, разліку аднаразовай субсідыі і вызначэння максімальнага нарміравальнага кошту жылога памяшкання для прадастаўлення субсідый на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам.

Ён складзе: 1359 рублёў — па шматкватэрных жылых дамах і па аднакватэрных, блакіраваных жылых дамах (кватэрах у блакіраваным жылым доме) у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва больш як 20 тысяч чалавек; 1968 рублёў — па дамах (кватэрах у блакіраваным жылым доме) для грамадзян, якія будуюць і набываюць жыллё, пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек; 1563 рублі — па дамах у вёсцы, якія будуюцца, набываюцца шматдзетнымі сем'ямі, што пастаянна жывуць там.

Гранічны нарматыў кошту 1 кв. м агульнай плошчы жылога памяшкання прымяняецца: па шматкватэрных жылых дамах, якія будуюцца па дагаворах стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва і шляхам стварэння арганізацый забудоўшчыкаў, апавяшчэнне аб вытворчасці будаўнічамантажных работ па якіх накіравана ў органы дзяржаўнага будаўнічага нагляду пасля ўступлення ў сілу пастановы; па дамах, пабудаваных па дзяржзаказе, уведзеных у эксплуатацыю пасля ўступлення ў сілу пастановы; па аднакватэрных, блакіраваных жылых дамах (кватэрах у блакіраваным жылым доме), якія будуюцца, а таксама па жылых памяшканнях, што набываюцца па дагаворах куплі-продажу, за выключэннем жылых памяшканняў у дамах, пабудаваных па дзяржзаказе, — на падставе спісаў на атрыманне льготных крэдытаў або рашэнняў аб прадастаўленні субсідый.

Таксама ўстаноўлены лімітны паказчык кошту 1 кв. м агульнай плошчы жылога дома (кватэры) у памеры 1563 рублёў для выдачы ААТ «Белаграпрамбанк» ільготнага крэдыту ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта ад 2 верасня 1996 года № 346 па аб'ектах, па якіх прадастаўленне льготных крэдытаў пачата пасля 1 студзеня 2025 года.

Прававы акт вызначае аб'ёмы на 2025 год будаўніцтва жылых дамоў з электраацяпленнем, жылля для шматдзетных сем'яў, жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання, арэнднага жылля, жылых дамоў або кватэр у гарадах-спадарожніках, рэканструкцыі і фінансавання арэнднага жылля, затрат на аб'екты інжынернай і транспартнай інфраструктуры ў забудове аграгарадкоў і іншае.

Цалкам з пастановай урада можна азнаёміцца на Нацыянальным прававым партале Беларусі.

КАМПЕТЭНТНА

# «КВАДРАТ» АДПАВЯДАЕ ЗАРОБКУ

## Ці стане кватэра больш даступнай?







**Даступнасць жылля — гэта вельмі актуальнае пытанне. «Менавіта таму ўрад ужо прарабіў пэўную работу. Ужо цяпер прыярытэты па жыллёвым будаўніцтве крыху ссоўваюцца. Значна больш сур'ёзная роля адводзіцца будаўніцтву арэнднага жылля, мы працягваем развіваць гэты кірунак, што адлюстравана ў стратэгіі развіцця», — падкрэсліў у эфіры «Першага інфармацыйнага» тэлеканала міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Руслан ПАРХАМОВІЧ.**

Міністр адзначыў, што недастаткова звярталі ўвагу на рэнавацыю. «На жаль, жыллёвы фонд не вечны, ён старэе і страчвае свае ўласцівасці па камфортнасці, таму неабходна звяртаць на гэта сур'ёзную ўвагу. Будаваць новае і забываць пра старое, — адмоўная тэндэнцыя. Мы хутка пачнём страчваць у абсалютных лічбах свой жыллёвы фонд, — звярнуў увагу ён. — Таму трэба не толькі будаваць новае жыллё, але яшчэ і прыводзіць у парадак тое, якое ўжо, на жаль, не адпавядае ўсім тым патрабаванням, на якія разлічваюць грамадзяне. Таму асобным кірункам на будучае дзесяцігоддзе для нас з'яўляецца рэнавацыя. Безумоўна, гэта і павышэнне даступнасці, і павелічэнне забяспечанасці квадратнымі метрамі».

**Змяняюцца падыходы і да забеспячэння «квадратамі». «Вядома, сёння ў нас нядрэнны паказчык, але я думаю, што ён павінен быць значна большым, — лічыць Руслан Пархамовіч. — Калі 30 квадратных метраў цяпер для нас добрая норма, то 40—45 квадратных метраў на чалавека — той аптымальны аб'ём жылля, які павінен быць для камфортнага пражывання».**

Адказваючы на пытанне, колькі будзе кошт квадратнага метра, напрыклад, праз 10 гадоў, ці выгадна інвеставаць у кватэру, кіраўнік Мінбудархітэктуры заўважыў, што нейкіх значных перакосаў тут не будзе. Па яго меркаванні, ёсць няўхільны прынцып: кошт квадратнага метра жылля, пабудаванага з выкарыстаннем дзяржпадтрымкі, не павінен перавышаць памер сярэднямесячнага заробку. «Мы ад гэтага прынцыпу не адыходзім. І я думаю, што і ў 2035 годзе ён будзе, безумоўна, выкананы. Гэта базавы прынцып, якога варта прытрымлівацца. Усё астатняе прадыктуе рынак».

Міністр адзначыў, што рынак Мінска — гэта асобная тэма. «Тут, безумоўна, кошт вышэйшы, таму што гэта сталіца. Ёсць абласныя цэнтры, ёсць малыя населеныя пункты, — падкрэсліў Руслан Пархамовіч. — Але мы будзем звяжаць на кожны з гэтых рынкаў і выпрацоўваць па кожным з іх асобныя падыходы для таго, каб у цэлым для ўсіх абсалютна грамадзян мы мелі аднолькавыя ўмовы, каб камфортна сябе людзі адчувалі як у сельскай мясцовасці, так і ў сталіцы».

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390 |
| **Продавец** | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4, УНП 500041006 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 — **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**31/50 доли в праве собственности на здание нежилое** (инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, составные части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100.** В состав лота входят **канализационные сети** (инв. № 450/С-31477, 82,6 м). ***Сведения о земельных участках***: пл. **0,8074** га, предоставлен на праве постоянного пользования; три участка предоставлены на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072), пл. **0,0001 га, 0,0001 га, 0,0016 га. Обременения: площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду.** Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by.

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 3 818 184,00 бел. руб.**

**Лот № 2**

**Здание** (здание специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24780, общ. пл. 414,8 кв. м, составные части и принадлежности: две пристройки); **канализационные сети** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24783, составные части и принадлежности: канализац. колодец); **тепловая сеть** (сооружение специализир. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-24781). **Обременение: договор аренды.** Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Брестская, д. 67, корп. 1.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0587 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.09.2071) для строительства и размещения объектов коммунального хозяйства. В состав лота входит иное имущество: линия электросетей м-н Интерьер.

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 120 622,80 бел. руб.**

**Лот № 3**

**Склад (баня)** (здание многофункциональное, инв. № 450/С-18993, общ. пл. 318 кв. м, составные части и принадлежности: уборная, три пристройки, ворота, забор). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Хлюпина, д. 14.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1445 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 01.11.2041) для строительства и обслуживания здания склада (бани).

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 25 920,00 бел. руб.**

**Лот № 4**

**Столовая** (здание специализированное для общественного питания, инв. № 450/С-18925, общ. пл. 672,7 кв. м, составные части и принадлежности: подвал, две пристройки, электроснабжение (1), канализационная сеть (Д), водопроводная сеть (Е), канализационный колодец (д1), водопроводный колодец (е1), покрытие (Ж, И, К), плиточное покрытие (Л), бордюр тротуарный (Л1), ограждение (М, Н), калитка (Н1)). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 283, корп. 1.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1316 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 20.09.2071) для строительства и обслуживания здания столовой.

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 331 716,00 бел. руб.**

**Лот № 5**

**Административное здание (совместно с гаражом и котельной)** (здание многофункциональное, инв. № 450/С-29152, общ. пл. 547,3 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка, дымовая труба), **склад № 2** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 450/С-29155, общ. пл. 568 кв. м, составные части и принадлежности: пристройка (2Б/кз), пристройка (1)); **трансформаторная подстанция** (сооружение специализированное энергетики, инв. № 450/С-29156, общ. пл. 40,1 кв. м); **здание проходной** (здание специализированное иного назначения, инв. № 450/С-29153, общ. пл. 31.6 кв. м.); **благоустройство территории** (сооружение неустановленного назначения, инв. № 450/С-31422, общ. пл. 1076,1 кв. м; составные части и принадлежности: А-благоустройство территории, а.1 покрытие, а1.1 бордюр, а2 ограждение, а2.1 ворота, а3 эстакада, а3.1 ограждение). Адрес: **Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Минский Тракт, д. 4, корп. 1-3, д. 4, 4/4.** ***Сведения о земельном участке***: пл. **0,6679 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия: по 30.07.2068) для размещения объектов оптовой торговли, материально-технич. и продовольствен. снабжения, заготовок и сбыта продукции. В состав лота входит иное имущество: котел отопительный твердотопливный КОТВ-95; насос К45/30с дв. 7,5/3000.

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 430 080,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившиеся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере по лоту № 1 — **2 %**, по лотам № 2, 4, 5 — **4 %,** по лоту № 3 — **6 %** от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 29.01.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 28.02.2025 г. с 11.00 до 12.00.**

Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.02.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35. Email: auction@cpo.by**



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Заполье, д. 2 Швабского сельисполкома Логойского района Минской области

| | |
|---|---|
| Форма проведения аукциона | Открытый |
| Наименование предмета аукциона | Жилой дом |
| Дата, время и место проведения аукциона | 18 марта 2025 года в 10.00, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельисполком, зал заседаний |
| Продавец и его адрес, телефоны | Швабский сельский исполнительный комитет, 223118, Минская область, Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, тел. (1774) 59-2-35; (1774) 59-1-35; А1 (29) 1061617 |
| Местонахождение имущества | Минская область, Логойский район, д. Заполье, д. 2 |
| Общая площадь жилых помещений | 57,9 кв. м |
| Жилая площадь | 39,5 кв. м |
| Описание имущества | одноэтажный, одноквартирный жилой дом, материал стен – дерево, деревянные перекрытия, крыша – шифер, отопление – печное. Водоснабжение — центральное, газоснабжение – баллон. Электроснабжение – центральное. Степень износа – 50 %. Составные части и принадлежности: холодная пристройка, 2 сарая |
| Условия аукциона по продаже пустующих домовладений | возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей | 5299,50 бел. руб. |
| Сумма задатка и реквизиты продавца | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **1059,90 руб.** получатель Швабский сельисполком, BY21AKBB36006191611010000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, г. Логойск, ул. Пролетарская, д. 1, УНП 600537220, код платежа 04707 |
| Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (без учета стоимости размещения извещения о проведении аукциона), бел. руб. | 662,22 руб. + объявление в газету |
| Адрес земельного участка | Минская область, Логойского район, д. Заполье, д. 2 |
| Площадь земельного участка | не зарегистрирован |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Дата начала приема документов | С даты объявления аукциона |
| Окончательный срок приема документов | 12 марта 2025 года до 16.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года № 844, п. 1, на основании решения Швабского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе предоставляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:

-копия платежного поручения о внесении суммы задатка;

-гражданин предъявляет – документ удостоверяющий личность;

- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Швабским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразившие согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязаны** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона;

- подать заявление о предоставлении земельного участка;

- после принятия соответствующего решения - обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.



## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)

информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего

**Фанипольскому сельскому исполнительному комитету** (Продавец) на праве оперативного управления.

**Электронные торги состоятся 18.03.2025 г.**

**Лот № 1:** VAZ-21214, кузов (рама) № XTA212140G2253684.
Начальная цена без НДС – 8 300,00 руб.
Местонахождение: Минская обл. Дзержинский район, Фанипольский с/с, д. Вязань, 1А.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182


ДОБРАЯ НАВІНА

# НАДЗЕЙНЫ КІЛАВАТ

## У Магілёве запусцілі аўтаномную электрападстанцыю для новага мікрараёна

Мікрараён Саломінка-2 вырас літаральна на вачах. Ён разлічаны на 30 тысяч жыхароў. Яго галоўная асаблівасць у тым, што аб'екты сацыяльнай сферы і жыллёвы фонд тут цалкам электрычныя.



І новая закрытая падстанцыя 110/10 кВ «Саломінка» з двума ўнутранымі сілавымі трансфарматарамі намінальнай магутнасцю па 60 МВА надзейна забяспечыць яго электраэнергіяй. Падстанцыя пабудавана ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь «Аб зацвярджэнні Праграмы комплекснай мадэрнізацыі вытворчасцяў энергетычнай сферы на 2021–2025 гады».

Аб'ект сам па сабе перадавы, аснашчаны сучасным высокатэхналагічным абсталяваннем, у асноўным беларускай вытворчасці. Кіраваць ім будуць на адлегласці, што забяспечыць пастаянны маніторынг і зменшыць эксплуатацыйныя выдаткі.

Праектам былі прадугледжаны таксама рэканструкцыя існуючай падстанцыі 110 кВ «Сельмаш» і будаўніцтва кабельнай лініі 110 кВ «Саломінка-Сельмаш». Для рэалізацыі хапіла 15 месяцаў замест нарматыўных 23, агульная сума ўкладзеных сродкаў склала 48 мільёнаў рублёў. Вакол будынка праведзена добраўпарадкаванне, зроблены пад'язныя шляхі і пешаходныя сцяжынкі.

**Генеральны дырэктар РУП «Магілёўэнерга» Канстанцін ПУЦІЛА** назваў адкрыццё падстанцыі ў мікрараёне Саломінка-2 маштабным інфраструктурным праектам для Магілёўскай энергасістэмы.

— Гэта лічбавая падстанцыя супернадзейная, сюды ўкладзены найсучасныя тэхналогіі і распрацоўкі ў электратэхнічнай прамысловасці, — падкрэсліў ён. — Вы бачыце, што вакол няма ніводнай апоры, пракладзена сем кіламетраў кабельных ліній 110 кВ. На найбліжэйшыя як мінімум 30 гадоў нічога ў гэтую падстанцыю не трэба ўкладваць. Яна будзе бездакорна працаваць.

Надзейнасць, бяспека і высокая тэхналагічнасць — так характарызуюць аб'ект спецыялісты.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Сяргей НАЛІВАЙКА** звярнуў увагу на тое, што аб'ект адпавядае ўсім патрабаванням пяцігодкі якасці і Года добраўпарадкавання.

— Мы ведаем, якую вялікую ўвагу кіраўнік дзяржавы ўдзяляе энергабяспецы і энерганезалежнасці краіны, — адзначыў ён. — Мы помнім, пад якім ціскам успрымалася яго рашэнне аб будаўніцтве АЭС. Час паказвае, што яно было правільным. І цяпер стаіць задача нарошчваць энергаспажыванне. Энергасістэма нашай краіны, у тым ліку Магілёўшчыны, дэманструе ўстойлівасць і бяспеку. Калі мы кажам пра пяцігодку якасці, то разумеем, што пад гэтым маецца на ўвазе паляпшэнне якасці жыцця грамадзян. Для гэтага і адкрываюцца новыя аб'екты.

Знамянальнай для магілёўскай энергасістэмы падзеяй назваў увод у строй электрападстанцыі **міністр энергетыкі Рэспублікі Беларусь Аляксей КУШНАРЭНКА**. Ён падзякаваў усім, хто з гонарам выканаў сваю прафесійную місію, каб зрабіць гэту надзейную крыніцу энергазабеспячэння для мікрараёна, дзе электрычнасць выкарыстоўваецца для ацяплення, гарачага водазабеспячэння, прыгатавання ежы.

**Мэр Магілёва Аляксандр СТУДНЕЎ** у сваёй прамове акцэнтаваў увагу на тым, што Магілёў апошнім часам вельмі дынамічна развіваецца — будуюцца масты, дарогі, жыллё. І адкрыццё передавой падстанцыі — яшчэ адно яскравае пацвярджэнне гэтаму. У аснове ўсяго — клопат пра камфорт і бяспеку жыхароў горада.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ЭКАБЯСПЕКА

# АД СТА ДА ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ — ПЛАСТЫК З НАМІ НАДОЎГА

## Напоі ў двухлітровых ПЭТ-бутэльках хутка знікнуць з паліц магазінаў

Пра новыя рашэнні для барацьбы з забруджваннем пластыкам гаварылі ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Удзельнікі прэс-канферэнцыі абмеркавалі ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне экалагічнай бяспекі краіны, сучасныя падыходы да абыходжання з адходамі, эфектыўныя метады перапрацоўкі пластыку.


Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

— Экалагічныя праблемы, якія стаяць перад чалавецтвам, становяцца ўсё больш актуальнымі ва ўмовах імклівага росту прамысловай вытворчасці і ўзмацнення антрапагеннай нагрузкі на навакольнае асяроддзе. На думку экспертаў, такая сітуацыя з'яўляецца сур'ёзнай пагрозай не толькі экасістэмам, але і здароўю людзей і будучых пакаленняў, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК**.

Для экасістэм не існуе меж: змяненне іх натуральнага балансу ў адной краіне амаль непазбежна прывядзе да аналагічных змяненняў у іншай. Таму пытанні забеспячэння экалагічнай бяспекі Беларусі ўваходзяць у лік прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі.

Паводле слоў кіраўніка прыродаахоўнага ведамства, ступень абароненасці насельніцтва і навакольнага асяроддзя ад антрапагенных і прыродных уздзеянняў з'яўляецца прымальнай для забеспячэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Аднак пытанні выкідаў, утварэння і ўтылізацыі адходаў, прадухілення дэградацыі экасістэм па-ранейшаму актуальныя. Асабліва пільная ўвага аддаецца праблеме пластыкавага забруджання.

Сусветны аб'ём утварэння пластыкавых адходаў (поліэтыленавых пакетаў, пенапластавых вырабаў, аднаразовага пластыкавага посуду і інш.) — каля 430 млн тон у год. У Беларусі толькі ў складзе вытворчых адходаў штогод атрымліваецца прыкладна 200 тысяч тон пластыку.

— Небяспека ў тым, што пластык мае працяглы перыяд распаду — ад 100 да 1000 гадоў. Трапляючы ў навакольнае асяроддзе, ён распадаецца на мікрапластык, які пасля лёгка ўбудоўваецца ў харчовыя ланцужкі і патэнцыяльна можа пагражаць чалавеку, — адзначыў Сяргей Масляк.

Каб паменшыць утварэнне пластыкавых адходаў, з 2020 года ў Беларусі вядзецца комплексная работа па замене палімернай упакоўкі на экалагічна чыстую.

— У 2024 годзе план быў дапоўнены і цяпер ажыццяўляецца ў пяці кірунках. У першую чаргу гэта пытанні, звязаныя з удасканаленнем сістэмы абыходжання з адходамі і скарачэння выкарыстання палімернай упакоўкі, правядзеннем навуковых даследаванняў, вытворчасцю і ўжываннем экалагічна бяспечнага пакавання, тэхнічным рэгуляваннем і скарачэннем імпарту палімерных упаковак, — растлумачыла **начальнік упраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі Мінпрыроды Вольга САЗОНАВА**.

З 1 студзеня 2026 года адпаведнай пастановай урада будуць уведзены абмежаванні на продаж піва і слабаалкагольных напояў у палімернай упакоўцы намінальным аб'ёмам звыш 1,5 літра. Таксама ўнесены змены ў пастанову, якая рэгламентуе прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў. Так, павялічыцца спіс тавараў, вытворцы і пастаўшчыкі каторых будуць несці адказнасць за арганізацыю збору адходаў, у якія гэтыя тавары ператвараюцца.

Яшчэ адным важным кірункам барацьбы з пластыкавым забруджваннем з'яўляецца інфармацыйна-асветніцкая дзейнасць.

— Павышэнне ўзроўню экаадукацыі мае вялікае значэнне ў фарміраванні свядомасці і паводзін грамадзян, спрыяе развіццю ўстойлівых звычак, такіх як перапрацоўка матэрыялаў, эканомія рэсурсаў і выкарыстанне экалагічна чыстых тавараў. Толькі сумеснымі намаганнямі можна дабіцца станоўчых змяненняў і забяспечыць устойлівую будучыню для наступных пакаленняў, захаваць планету для будучага жыцця, — рэзюмаваў Сяргей Масляк.

**Александрына ПАРШЫНА.**

ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ

# ПАБУДУЕМ — БУДЗЕМ ЖЫЦЬ!

## Якія пазітыўныя змены чакаюць інфраструктуру Віцебска ў 2025 годзе?

З году ў год паўночная сталіца Беларусі прырастае новымі аб'ектамі, імкнучыся павысіць якасць жыцця гараджан. Сёлетні год не стане выключэннем.




Яшчэ адзін дзіцячы сад з'явіцца ў густанаселеным мікраёне Білева-3. Гэты аб'ект стане вынікам сумеснага інвестыцыйнага праекта Віцебска і славенскай будаўнічай кампаніі.

На вуліцы Воінаў-інтэрнацыяналістаў нарэшце будзе адкрыты лазнева-аздараўленчы комплекс агульнай плошчай 4,5 тысячы квадратных метраў. Там плануюць аказваць шырокі спектр аздараўленчых паслуг, якія дазволяць віцябчанам і гасцям горада прытрымлівацца актыўнага ладу жыцця і клапаціцца аб сваім здароўі. На першым паверсе комплексу размесцяцца руская лазня, фінская саўна, турэцкі хамам і пакоі адпачынку, другі паверх будзе адведзены пад фізкультурна-аздараўленчы цэнтр з вялікай трэнажорнай залай. Асобнае памяшканне ўладкуюць пад групавыя трэніроўкі, на другім паверсе таксама будуць размешчаны кабінеты масажу, касметычныя салоны.

У гістарычным цэнтры горада на Дзвіне адновіцца рэканструкцыя былога манастыра базіліян, дзе размесціцца дзіцячая мастацкая школа. Пазітыўныя змены закрануць і Парк чыгуначнікаў, у гараджан рознага ўзросту з'явяцца новыя магчымасці для адпачынку на свежым паветры.

У сферы будаўніцтва акцэнт сёлета будзе зроблены на развіцці інфраструктуры віцебскага мікраёна Тарны, дзе плануюць узвесці сем шматпавярховых жылых дамоў. У сувязі з тым што новыя мікраёны горада актыўна засяляюцца, ААТ «Віцебскаблаўтатранс» абнаўляе і пашырае парк тэхнікі.

Праз некалькі гадоў на месцы некалькіх карпусоў завода «Віцязь», якія не выкарыстоўваюцца, з'явіцца маштабны аквапарк. Ідэя аб яго стварэнні нарадзілася восенню мінулага года. Цяпер поўным ходам вядуцца дэмантажныя работы ў будынках, выкупленых інвестарам. На аб'екце, які плануюць зрабіць сапраўдным акватэрмальным комплексам, акрамя шматлікіх атракцыёнаў, будуць працаваць сучасны фітнес-цэнтр, рэстаран і гасцініца, што дазволіць гасцям горада атрымаць усе віды паслуг у адным месцы і адпачыць з камфортам.

Сёлета сур'ёзна зменіцца і парк 1000-годдзя Віцебска, дзе запланаваны маштабныя работы па добраўпарадкаванні і азеляненні. Плануецца адкрыццё Плошчы сцяга і герба ў паўночнай частцы парку. На аб'екце ўжо ўстанавілі 69-метровы флагшток і святлодыёдныя экраны. На ім будзе ўзняты Дзяржаўны сцяг памерам амаль 100 квадратных метраў.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота «Витебские вести».**


## Извещение о проведении повторного аукциона

**Организатор аукциона**: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

**Продавец:** ОАО «АГАТ-стройсервис», 231103, Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173

| № лот | Инв. номер | Предмет аукциона | Начальная цена с НДС 20 %, бел руб. (снижена на 75%) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Оборудование (б/у), расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173** | | | | |
| 1. | | Оборудование и строительный инструмент, реализуемый одним лотом, в количестве 32 ед. **Подробный перечень размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by** | 3271,80 | 163,59 |
| 2. | | Имущество, реализуемое одним лотом: холодильник Атлант Х-1401-100, XEROX 3100 MFPV S (инв. номер 000000091), персональный компьютер «Сильверадо» (инв. номер 000000076) | 83,10 | 4,16 |
| 3. | 000000055 | Емкость для ГСМ (5 м³) | 183,00 | 9,15 |
| 4. | 000000043 | Пилорама Р-634Б | 10230,00 | 511,50 |
| 5. | 000000075 | Станок прирезной многопильный | 960,00 | 48,00 |
| 6. | 000000014 | Станок рейсмусовый ЦКБ-40-1 | 1080,00 | 54,00 |
| 7. | 000000040 | Станок фрезерный ФСШ-1 | 660,00 | 33,00 |
| 8. | 000000074 | Штукатурная станция | 570,00 | 28,50 |
| 9. | 000000052 | Долбежный станок | 198,00 | 9,90 |
| **Транспортные средства и спецтехника (б/у), расположенная по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173** | | | | |
| 10. | 000000079 | Микроавтобус вагон (wagon) ГАЗ-322132, 2005 г. в., рег. знак АВ 3564-4 | 720,00 | 36,00 |
| 11. | 000000170 | Тракторный прицеп | 1470,00 | 73,50 |
| 12. | 000000022 | Тракторный прицеп, 1,7 т | 114,00 | 5,70 |
| 13. | 000000026 | Тракторный прицеп железный ПТС-6 | 1680,00 | 84,00 |

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **27.02.2025 г.** в 12.00 по адресу**: 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **25.02.2025 г.** до 17.00 по адресу: **220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка».** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Совринович Алексей Генрихович, тел. +375 (44) 767-78-80.

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайтах организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Затраты** и вознаграждение (10 % от цены продажи) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 24.01.2025 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным, без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 (44) 704-92-06, Email: info@ipmtorgi.by** |



## РУП «Институт недвижимости и оценки»
### (Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)

информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего

**ГУ «Свирский социальный пансионат «Маяк»**
(Продавец) на праве оперативного управления

**Электронные торги состоятся 17.03.2025 г.**

Лот № 1: VAZ CHEVROLET NIVA,
номер кузова (VIN) № X9L212300D0468802.
Начальная цена без НДС – 7 000,00 руб.

Местонахождение: Минская обл., Мядельский р-н,
Свирский сельсовет, 22/5, в районе д. Лущики.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

**Организатор электронных торгов: 8 (017) 324-70-57;**
**8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10%):

| № объекта | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение (назначение: здание специализированное финансового назначения; наименование: здание отделения банка) с инвентарным номером 200/С-80795, общей площадью 77,9 кв. м. (принадлежности: сарай, уборная, две калитка, ворота, пешеходные дорожки, площадки, проезд, автостоянка, площадка для мусорных контейнеров, канализационная сеть, участок сети наружного освещения, ограждение (200990020102327), водопроводная сеть (200990020102192), участки сети электроснабжения (200990020102194)) | Витебская обл., г. п. Яновичи, ул. Унишевского, 12 | 9 648,00 (девять тысяч шестьсот сорок восемь рублей 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % — 1 608,00 (одна тысяча шестьсот восемь рублей 00 копеек) |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление №200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1, в срок — до 16.00, в пятницу — до 15.00 по 21.03.2025 г.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 21.03.2025 г. на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 25.03.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретают объекты основных средств по стоимости 1 261,20 руб. (в т.ч. НДС 20 %): приточный агрегат tip отд. 200/126 (инв.номер 200990020102193), котел отопительный водогрейный КЧУ в количестве 2 шт. (инв.номера 200990020102195, 200990020102196), счетчик учета электроэнергии трехфазный в количестве 2 шт. (инв.номер М 200990000047541, М 200990000047542), манометр НП в количестве 4 шт. (инв.номера ВН 200990110006056, ВН 200990110006057, ВН 200990110006058, ВН 200990110006059).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее, чем за три рабочих дня до даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55; 8(029) 309-42-19.**



## Извещение о проведении повторных электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф.5. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БИП-С Плюс», г. Минск, ул. Короля, дом 3, к. 41в, УНП 190575262 |

**Предмет электронных торгов:**

**Административно-хозяйственное помещение** (Административное помещение), инв. № 160/D-9672, общ. пл. 692,9 м², по адресу: ***Брестская обл., г. Пружаны, ул. Октябрьская, д. 104-1***

**Начальная цена лота с НДС 20 % — 50 000,00 долл. США***

*Примечание: цена продажи Предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах электронных торгов в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения электронных торгов.

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638.

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов.

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.01.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**: **28.02.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.02.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by.

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. Email: info@ipmtorgi.by** |


# ПАДЛЯЧЫЦЦА І АДПАЧЫЦЬ





## ЧЫМ ПРЫВАБНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МЕДЫЦЫНА?

Як патлумачыў **кіраўнік дзяржаўнага праекта «Клінікі Беларусі» Ян БЕДУШЭЎСКІ**, акрамя цэн і якасці медыцынскіх паслуг, замежнікаў прываблівае і хуткасць аказання медыцынскіх паслуг.

— Паездка ў Беларусь за адносна невялікую суму дае магчымасць прайсці абследаванне тут і цяпер, што часта дазваляе пачаць лячэнне на больш ранніх стадыях, — адзначыў Ян Бедушэўскі. — Найбольш папулярнымі кірункамі медыцынскага турызму з'яўляюцца трансплантalогія, анкалогія, кардыяхірургія, пластычная хірургія, акушэрства, нейрахірургія, траўматалогія, дыягнастычныя абследаванні, прафілактычнае лячэнне, аднаўленне пасля перанесеных хвароб, афтальмалогія, а таксама адпачынак у аднаўленчых установах нашай краіны.

Спрыяе медыцынскаму турызму і шырокая сетка лячэбна-дыягнастычных устаноў, якая ахоплівае ўсе кірункі медыцынскай дзейнасці. У Беларусі функцыянуе 16 РНПЦ. Для прасоўвання медыцынскіх паслуг, у тым ліку і за мяжой, створаны і паспяхова функцыянуе дзяржаўны медыцынскі партал «Клінікі Беларусі».

## АДМЕТНАСЦЬ САНАТОРЫЯЎ — ЯКАСНЫ МЕДЫЦЫНСКІ СКЛАДНІК

За мінулы год у беларускіх санаторыях пабывала 246 тысяч замежных грамадзян. Пераважна гэта адпачывальнікі з Расіі. Але ёсць і грамадзяне экзатычных краін з усіх пяці кантынентаў, уключаючы Паўднёвую Амерыку, Афрыку і Аўстралію. Усяго летась у беларускіх санаторыях пабывалі грамадзяне 63 краін свету.

Увогуле, мінулы год для сістэмы санаторна-курортнага лячэння быў самым паспяховым з 2006 года — моманту яе рэфармавання. Шэраг паказчыкаў удалося дасягнуць упершыню. У прыватнасці, летась аздараўленне ў беларускіх здраўніцах прайшла максімальная з 2006 года колькасць наведвальнікаў — 1 мільён 568 тысяч чалавек (на 6 % больш, чым у 2023-м), у тым ліку 760 тысяч — без выкарыстання бюджэтнага фінансавання.

Дасягнуты рэкордныя лічбы па выручцы, яна перавысіла 1 мільярд 200 мільёнаў рублёў. Экспарт паслуг перавысіў 400 мільёнаў рублёў — амаль на 30 % больш, чым у 2023-м.

У краіне дзейнічае шырокая сетка санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый. Яна ўключае 287 аб'ектаў больш як на 61 тысячу месцаў, з іх 97 больш як на 27 тысяч месцаў — санаторыі.

— Велізарная ўвага ўдзяляецца забеспячэнню нашага насельніцтва, у першую чаргу дзяцей, бясплатнымі і больш таннымі пуцёўкамі. У мінулым годзе на гэтыя мэты дзяржава выдзеліла больш як 252 мільёны рублёў. За кошт гэтых сродкаў санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем забяспечана больш чым 807 тысяч грамадзян. Каля 70 працэнтаў ад асноўнага фінансавання адпраўляецца на аздараўленне, — адзначыў **намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксандр ЦАЙ.**

Вядзецца ўмацаванне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай і медыцынскай базы. Гэтаму ўдзяляе ўвагу як дзяржава, так і ўласнікі санаторыяў. Летась на гэтыя мэты накіравана больш за 220 мільёнаў рублёў.

У здраўніцах прапануецца шырокі пералік паслуг. Летась распрацавана 59 новых праграм санаторна-курортнага лячэння. Яны разлічаны на розныя тэрміны знаходжання ад 3 да 21 дня і больш. Санаторыі аказваюць больш як 120 медыцынскіх паслуг.

— Практычна ўсе санаторна-курортныя арганізацыі ў нас шматпрофільныя, што дае магчымасць забяспечыць даступнасць працэдур для ўсіх грамадзян, — адзначыў Аляксандр Цай. — Дынамічна развіваюцца такія фізіятэрапеўтычныя метады, як карбаксітэрапія, оксігенатэрапія, азонатэрапія, мінералатэрапія. Актыўна пачаў развівацца касметалагічны і стаматалагічны кірункі.

## ПАДКУПЛЯЕ БЯСПЕКА

Для любога турыста паказчыкам свабоднай паездкі ў розныя краіны з'яўляецца бяспека, адзначыла **дырэктар кампаніі медыцынскага турызму «Трыястайл» Дзінара ВАРАНЦОВА.**

— Гэта такія крытэрыі, як бяспека прылёту, бяспека знаходжання ў краіне, бяспека атрымання той ці іншай паслугі, у тым ліку медыцынскай, бяспека валютна-грашовых аперацый. Заўсёды прыемна атрымліваць зваротную сувязь ад калег, партнёраў, пацыентаў, якія прыляталі ў нашу краіну, аб тым, што Беларусь адпавядае абсалютна ўсім крытэрыям бяспекі, — падкрэсліла Дзінара Варанцова.

Акрамя таго, і ў суседніх краінах, і ў далёкім замежжы вядома, што строгі дзяржаўны кантроль таксама гарантуе бяспеку. Напрыклад, замежны турыст ведае: што ўсе беларускія дзяржаўныя клінікі і прыватныя медыцынскія цэнтры атрымалі дзяржаўную ліцэнзію, а ўсё медыцынскае абсталяванне, медпрэпараты і расходнікі абавязкова сертыфікаваны.

Садзейнічае росту колькасці замежных турыстаў наяўнасць у нашых клініках палат павышанай камфортнасці і палат гасцінічнага тыпу, пансіянатаў для суправаджальнікаў.

— Бязвізавы ўезд аблегчыў прыезд у нашу краіну замежных грамадзян. Больш за тое, жыхары тых краін, дзе ўсё ж неабходна атрыманне візы, могуць атрымаць яе па спрошчаным парадку — электронную ці па прылёце ў аэрапорт, ёсць электронная рэгістрацыя. Дзяржава падышла максімальна ўважліва, каб забяспечыць камфортны прылёт і знаходжанне ў нашай краіне, — адзначыла Дзінара Варанцова.

Хто ж ён, замежны медыцынскі турыст? Гэта чалавек, які сумяшчае падарожжа і дыягностыку свайго здароўя, або той, хто прыехаў па эстэтычную прыгажосць (на пластычную аперацыю, па стаматалагічныя паслугі ці для змяншэння вагі) ці адпачыць у беларускім санаторыі. Ёсць і замежнікі, якія прыязджаюць для лячэння па экстранных паказаннях.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

# УСЁ — У СЯМ'Ю



## ЯКІЯ СЕМ'І ЛІЧАЦЦА МАЛАДЫМІ?

Маладой лічыцца сям'я, дзе адзін з сужэнцаў (або абодва) знаходзіцца ва ўзросце да 31 года. Гэта ўстаноўлена Законам «Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі». Пры гэтым, улічваючы сярэдні ўзрост сённяшніх нявест і жаніхоў, часу пабыць у статусе маладой сям'і ў беларусаў зусім няшмат. У 2023 годзе сярэдні ўзрост нявест склаў 26,5 года, а сярэдні ўзрост жаніхоў — 28,8 года.

Дзяржаўныя гарантыі і льготы ахопліваюць усе асноўныя аспекты жыццядзейнасці сям'і: працоўныя адносіны і занятасць, падтрымка ў сферы адукацыі, аховы здароўя, падаткаабкладанне і інш. Як адзначыла Святлана Белаш, падтрымка маладых сем'яў у дзяржаўнай сямейнай палітыцы як асобны кірунак не выдзяляецца. Яе аказваюць у агульнай сістэме падтрымкі сем'яў пры нараджэнні дзяцей.

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ГАРАНТЫІ І ВЫПЛАТЫ

На што ж могуць разлічваць маладыя сем'і? Найперш гэта прамая матэрыяльная падтрымка ў выглядзе грашовых выплат. Акрамя таго, гэта бясплатнае медыцынскае суправаджэнне цяжарнасці і родаў, аплачвальны сацыяльны водпуск у перыяд цяжарнасці і родаў (дэкрэтны водпуск).

Студэнткам дзённай формы навучання на перыяд цяжарнасці даецца акадэмічны водпуск з 24 тыдня цяжарнасці пры нармальным яе ходзе і з любога тэрміну пры паталогіях. На гэты перыяд выплачваецца дапамога па цяжарнасці і родах. Пры гэтым калі студэнтка атрымлівае стыпендыю, то яе памер складае 100 % за кожны каляндарны месяц. Студэнткам дзённай формы навучання, якія працуюць, дапамогу па цяжарнасці выплачваюць па месцы вучобы з улікам заробку, які яна атрымлівае на рабоце.

Нагадаем, што з 1 студзеня вырас мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах:

— у два разы (з 50 да 100 % бюджэту пражытачнага мінімуму) для будучых мам — студэнтак, якія яшчэ не выйшлі на рынак працы; для тых, хто праходзіць службу ці афіцыйна беспрацоўны. На 1 лютага БПМ складае 447,64 рубля;

— у тры разы (з 50 % БПМ да 100 % мінімальнай заработнай платы) мінімальны памер бальнічнага па цяжарнасці і родах для застрахаваных жанчын, якія не маюць шасцімесячнага стажу працы, г. зн. толькі выйшлі на працу. Цяпер памер мінімалкі складае 726 рублёў.

Маці або тата, якія працуюць, або іншыя сваякі дзіцяці, якія працуюць, маюць права на водпуск па доглядзе яго (да дасягнення ім трох гадоў) з выплатай дапамогі за ўвесь гэты перыяд і з захаваннем працоўнага месца. Працоўным бацькам, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю, або адукацыю пасля ВНУ на дзённай форме навучання, даецца водпуск па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім трох гадоў. У выпадку калі мама працягвае вучобу на дзённай форме, то ці тата, які працуе (ці тата-студэнт), ці іншы працоўны сваяк можа пайсці ў водпуск па доглядзе дзіцяці з выплатай дапамогі.

Памер дапамогі складае 35—40 % ад сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад наяўнасці страхавога стажу маці або іншага сваяка «ў дэкрэце» і выплачваецца незалежна ад занятасці і даходаў.

З 1 лютага памеры дапамог па доглядзе дзіцяці да трох гадоў павялічаны. На першае дзіця гэта 861 рубель. На другога і наступных — 984 рублі. На дзіця з інваліднасцю — 1107 рублёў. Дарэчы, у перыяд водпуску па доглядзе дзіцяці бацькі могуць працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці з выплатай поўнай дапамогі.

Для маці або бацькоў, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці, прадугледжана гарантыя прадаўжэння працоўнага кантракта на тэрмін не менш як да дасягнення дзіцем узросту пяці гадоў.

Для сем'яў, у якіх выхоўваецца дзіця з інваліднасцю, прадугледжаны дадатковыя гарантыі: гэта пенсія па інваліднасці, дадатковыя дапамогі, сацыяльныя паслугі па доглядзе.

Яшчэ адзін від падтрымкі — сродкі сямейнага капіталу для шматдзетных сем'яў. У асноўным бацькі выкарыстоўваюць гэтыя грошы для паляпшэння жыллёвых умоў, аднак апошнім часам вырас попыт на аплату сямейным капіталам адукацыі дзяцей. Калі ў 2020 годзе на адукацыю дзяцей сямейны капітал расходавалі 6 % сем'яў, то ў 2024 годзе — ужо 13 % сем'яў.

## ДАДАТКОВЫ ВЫХАДНЫ

Бацькі, якія выхоўваюць дваіх дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў, маюць права на адзін дадатковы выхадны за месяц. Аплата гэтага выхаднога можа прадугледжвацца ў калектыўных дагаворах. Бацькі дзіцяці з інваліднасцю маюць права на адзін дадатковы выхадны за месяц. Ён аплачваецца за кошт сродкаў сацыяльнага страхавання.

Шматдзетныя бацькі, якія маюць траіх і больш дзяцей да 16 гадоў або дзіця з інваліднасцю да 18 гадоў, могуць браць адзін дадатковы выхадны на тыдзень. Ён аплачваецца за кошт сродкаў наймальніка. Ёсць альтэрнатыва гэтаму дадатковаму выхадному — скарачэнне штодзённай працы ці змены на 1 гадзіну. Той ці іншы варыянт узгадняецца з наймальнікам.

## ВОДПУСК ДЛЯ ТАТЫ І БЯСПЛАТНАЕ НАВУЧАННЕ

З 2020 года ён даецца бацьку на працягу першых шасці месяцаў з нараджэння дзіцяці. Працягласць водпуску — да 14 дзён, але калектыўным дагаворам працягласць такога водпуску, а таксама яго аплата можа быць зменена.

Беспрацоўныя бацькі, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў (у тым ліку з 1 студзеня 2025 года дзіцяці з інваліднасцю), маюць права на бясплатную прафесійную падрыхтоўку або перападрыхтоўку, або павышэнне кваліфікацыі з выплатай аднначасова стыпендыі і паўнацэннай дапамогі па доглядзе дзіцяці.

## ЯК АТРЫМАЦЬ ДАХ НАД ГАЛАВОЙ?

Як адзначыла Святлана Белаш, сярод беларусаў пытанне забяспечанасці жыллём з'яўляецца ключавым пры прыняцці рашэння аб стварэнні сям'і і нараджэнні дзяцей. Маладым сем'ям пры з'яўленні першага дзіцяці фінансавая дапамога дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах даецца ў памеры 10 % ад сумы запазычанасці па крэдыце, другога — 20 %.

Акрамя таго, у краіне прадугледжана прыцягненне крэдытаў камерцыйных банкаў з выплатай грамадзянам з бюджэту адрасных субсідый на пагашэнне часткі асноўнага доўгу і працэнтаў па такіх крэдытах. Малазабяспечаным маладым сем'ям прадстаўляюць субсідыю на пагашэнне асноўнага доўгу па крэдытах на будаўніцтва жылля пры нараджэнні першага дзіцяці — у памеры 10 % ад сумы запазычанасці, другога — 20 %.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

# У АГУЛЬНЫ, АЛЕ НЕ Ў СТРАХАВЫ СТАЖ

## Як улічваецца дэкрэтны водпуск пры назначэнні пенсіі?

Перыяды водпуску па доглядзе дзіцяці да трох гадоў улічваюцца ў агульны стаж, аднак не ўключаюцца ў страхавы. Пытанне, як гэтыя перыяды ўплываюць пры назначэнні пенсіі, — адно з найбольш распаўсюджаных у Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Пры назначэнні пенсіі перыяды водпуску (догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў) уключаюцца ў агульны стаж і тым самым улічваюцца пры вылічэнні памеру пенсіі. Прытым гэтыя перыяды ўключаюцца ў стаж толькі аднаму з бацькоў або працаздольных асоб, якія ажыццяўлялі догляд. У Мінпрацы нагадалі, што з 1 студзеня 2021 года агульная працягласць улічаных у агульны стаж перыядаў догляду дзяцей ва ўзросце да трох гадоў павялічана з 9 да 12 гадоў.

Аднак для назначэння працоўнай пенсіі па ўзросце неабходны не толькі агульны стаж, але і стаж работы з выплатай страхавых узносаў у пенсіённы фонд, так званы страхавы стаж. З 2025 года неабходны мінімальны страхавы стаж складзе 20 гадоў. Перыяды водпуску (догляду дзіцяці (дзяцей) ва ўзросце да 3 гадоў) у страхавы стаж не залічваюцца.

Пры гэтым у нашай краіне патрабаванні да страхавога стажу паніжаны шматдзетным маці, якія нарадзілі пяць і больш дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту. Ім дадзена права на працоўную пенсію па ўзросце са зніжэннем агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту на пяць гадоў. Пры гэтым патрабуецца пяць гадоў страхавога стажу і 15 гадоў агульнага стажу (з улікам страхавога).

Незалежна ад узросту пенсія па ўзросце назначаецца шматдзетным маці, якія нарадзілі пяць і больш дзяцей і выхавалі іх да 16-гадовага ўзросту, пры стажы работы на прадпрыемствах сельскай гаспадаркі непасрэдна ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі не менш як 10 гадоў (без заліку часу догляду дзяцей). Таксама шматдзетным маці, якія нарадзілі чацвярых дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту, працоўная пенсія па ўзросце назначаецца па дасягненні агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту пры паніжаным страхавым стажы пяць гадоў і пры наяўнасці 20 гадоў агульнага стажу (з улікам страхавога).

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**




## ИЗВЕЩЕНИЕ

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «МИНСКСТРОЙ» доводит до сведения заинтересованных лиц информацию о внесении дополнений в проектную декларацию (опубликована в газете «Звязда» от 12.12.2024 г. № 242 (30376) с изменениями от 13.12.2024 г. № 243 (30377) о строительстве жилых (нежилых) помещений и машино-мест в составе объекта строительства «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда»:

– **жилые помещения** в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Жилой дом № 1 по ГП (далее – объект № 1);

– **машино-места, супермаркет в** составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Вторая очередь строительства. Многоуровневая гараж-стоянка со встроенным супермаркетом № 3.2 по ГП (далее – объект № 2).

**Объект долевого строительства – жилое помещение (квартира); жилое помещение (квартира) с машино-местом; супермаркет.**

Для категории граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования настоящего извещения по объекту № 2 предлагается **супермаркет** общей площадью **2 013,8 кв. м** без выполнения внутренних отделочных работ.

Цены на объекты долевого строительства:

стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объекта долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет 4 100 бел. рублей.

Условия оплаты для супермаркета, содержащегося в настоящем извещении:

единовременная оплата **супермаркета** в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии оплаты **супермаркета** согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос составляет 30 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства по **июль 2025 года**. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**Заявления** о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) со следующего дня после публикации настоящего дополнения в порядке очереди по адресу: ул. К. Маркса, 13а, каб. 105. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (посредством телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с физическими и юридическими лицами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия декларации, не измененные (не исключенные) настоящим извещением, остаются неизмененными.

Подробные сведения об объекте строительства, планировках квартир и ходе строительства можно получить в отделе реализации объектов недвижимости и жилья по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105, тел. моб. +375 (29) 195 18 21, либо на сайтах: https://minskstroy.by, http://www.uyutnyi.by.

УНП 100071325



## ИЗВЕЩЕНИЕ

Для акционеров ОАО «Лукомльэнергомонтаж» о проведении годового общего собрания акционеров Общества **14 марта 2025 г.,**

расположенного по адресу: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район,

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и основных направлениях деятельности Общества в 2025 году.
2. Об утверждении годового отчета Общества, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли (покрытия убытков), выплате дивидендов за 2024 год и направлений распределения прибыли на 2025 год.
4. Об утверждении отчета наблюдательного совета о проделанной работе в 2024году.
5. Об избрании членов наблюдательного совета, ревизионной комиссии.
6. Об утверждении размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. О внесении изменений в устав ОАО «Лккомльэнергомонтаж» об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования акций, поступивших в распоряжение Общества в целях сокращения их общего количества.
8. О приобретении Обществом акций собственного выпуска на баланс Общества с целью их аннулирования.

Регламент проведения собрания акционеров:

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – **1 марта 2025 г**.

Время начала проведения собрания акционеров – **10.00**.

Место проведения собрания акционеров – **211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район, актовый зал Общества**

Форма проведения собрания акционеров – **очная**.

Орган, созывающий собрание: **наблюдательный совет**.

Регистрация участников собрания – **с 09.00 до 09.45** в день и по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, осуществляется при предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителя акционера – также документов, подтверждающих полномочия на участие в собрании.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 23 февраля 2025 г., в бухгалтерии Общества – с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания — с 09.00 до 09.45, по месту его проведения.

В случае отсутствия кворума на созываемом годовом общем собрании, повторное годовое общее собрание акционеров с той же повесткой дня будет проведено 26.03.2025 г. в 10.00, по адресу: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

УНП 300007839

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**о созыве годового за 2024 г.
общего собрания акционеров
ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис»**

Собрание состоится 21.03.2025 г. в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, к. 318. Собрание проводится по инициативе и решению Совета директоров общества.

Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 10.40 до 11.00.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет генерального директора о результатах деятельности ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2024 год и основные направления развития Общества на 2025 год.
2. Отчет и заключение ревизионной комиссии ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» о результатах деятельности за 2024 год.
3. Об аудите Общества по результатам финансово-хозяйственной деятельности ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» за 2024 год.
4. Об утверждении годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год.
5. Распределение чистой прибыли за 2024 год.
6. О выплате дивидендов за 2024 год.
7. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи в 2024 г.
8. О порядке распределения чистой прибыли ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис» на 2025 г.
9. Об избрании членов Совета директоров ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».
10. Об избрании ревизионной комиссии ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».
11. О продлении трудовых отношений с генеральным директором ЗАО «УКХ «БелГАЗавтосервис».

С информацией касающейся вопросов, включенных в повестку дня, лица имеющие право на участие в общем собрании могут ознакомиться с 19 по 20 марта 2025 года, в рабочие дни – с 10.00 по 12.00, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 25Б, комн. 314, а в день проведения собрания – во время и в месте его проведения.

Участникам собрания для регистрации необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий их личность, представителям акционера – также надлежащим образом оформленную доверенность.

УНП 100123046

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие **«Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (Организатор аукциона) по поручению **ОАО «Озерицкий-Агро»** (Продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе:

**- здание телятника с инв. № 614/С-48943, общей площадью 1314,1 кв. м;**

**- здание коровника с инв. № 614/С-48942** *(составные части и принадлежности: 3 (три) пристройки),* **общей площадью 1608,8 кв. м (далее – Объекты).**

**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 624800000001004920, площадью 3,0322 га** *(право постоянного пользования),* **по адресу: Минская область, Смолевичский район, Озерицко-Слободской с/с, в районе д. Аношки.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0450 га; охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,4320 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 330 224,98 бел. руб.**
